ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)
УДК 930.2:27
DOI: 10.29235/2524-2369-2018-63-2-196-205

Пастуліў у рэдакцыю 08.12.2017
Received 08.12.2017

**К. В. Сыцько**

*Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь*

# ПАЛЯВЫЯ АРХЕАГРАФІЧНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ: МЕТОДЫКА І АСАБЛІВАСЦІ ПРАВЯДЗЕННЯ

**Аннотация.** Всестороннее исследование конфессиональной истории Беларуси требует введения в научный оборот максимально широкого круга исторических источников. На примере деятельности Центрального научного архива Национальной академии наук Беларуси рассматриваются основные этапы и методика проведения полевых археографических экспедиций, направленных на пополнение источниковедческой базы по конфессиональной истории. На основании результатов полевых работ описываются места обнаружения уникальных документов; даётся характеристика основных факторов, которые повлияли на их сохранность; приводятся основные методы, позволяющие выявить данные исторические источники и ввести их в научное поле историка. Реконструируется исторический контекст хранения документных материалов в парафиях Римско-католического костёла в Беларуси. Результаты проведенных полевых работ свидетельствуют о том, что значительный комплекс исторических источников находится в парафиальных архивах и хранится согласно традиционной системе, существовавшей в римско-католическом делопроизводстве с конца XVI в. На основе выявленных в ходе археографической экспедиции документов и материалов в Центральном научном архиве Национальной академии наук Беларуси создана архивная коллекция 3С «Материалы полевых археографических экспедиций», которая содержит электронные копии исторических источников за XVI – середину XX в.

**Ключевые слова:** полевая археография, исторические источники, Римско-католический костёл, камеральная археография, архивная коллекция

**Для цитирования.** Сыцько, К. В. Палявыя археаграфічныя даследаванні: методыка і асаблівасці правядзення / К. В. Сыцько // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2018. – Т. 63, № 2. – С. 196–205. DOI: 10.29235/2524-2369-2018-63-2-196-205

**K. W. Sytsko**

*Institute of History, National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus*

## METHOD AND FEATURES OF CONDUCTING FIELD ARCHEOGRAPHIC EXPEDITIONS (ON THE EXAMPLE OF HEURISTICS OF SOURCES ON THE HISTORY OF ROMAN CATHOLIC CHURCH)

**Abstract.** Comprehensive study of the confessional history of Belarus requires the implementation of the wide range of historical sources. In the article the main stages and methods of field archaeographic expeditions aimed at replenishing the source base for confessional history studies are taken into consideration on the example of the Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus,. The locations of unique documents are described; the main factors that have affected their safety are characterised; the main methods that allow to identify these historical sources and introduce them into the scientific field are shown on the results of field work. The historical context of the preservation of documentary materials in the parishes of the Roman Catholic Church in Belarus is being reconstructed. The results of the field work show that a significant complex of historical sources is in the parish archives and is stored according to the traditional system that existed in the Roman Catholic tradition from the end of the XVIth century. Based on documents and materials discovered during the archaeological expedition, the archival collection 3C «Materials of field archaeographic expeditions» was created in the Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus, containing electronic copies of historical sources for the XIVth-mid-XXth centuries.

**Keywords:** Field archeography, historical sources, The Roman Catholic Church, cameral archeography, archival collection

**For citation.** Sytsko K. W. Method and Features of Conducting Field Archeographic Expeditions (on the Example of Heuristics of Sources on the History of Roman Catholic Church). *Vestsi Natsyianal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series,* 2018, vol. 63, no. 2, pp. 196–205 (in Belarusian). DOI: 10.29235/2524-2369-2018-63-2-196-205

**Уводзіны.** Актыўная распрацоўка гісторыі хрысціянскай царквы ў Беларусі ў апошнія дзесяцігоддзі з'явілася вынікам дастаткова вялікай колькасці навуковых даследаванняў. Варта, аднак, заўважыць, што ў дадзенай галіне гістарычнай навукі існуюць т. зв. «белыя плямы», звязаныя з недастатковасцю крыніцазнаўчай базы па тых ці іншых пытаннях.

© Сыцько К. В., 2018

На думку шэрага даследчыкаў, недастатковасць крыніцазнаўчай базы звязана з войнамі, стыхійнымі бедствамі, ідэалагічнымі кампаніямі, адтокам крыніц за мяжу [1, с. 128], з дзейнасцю «чорных» збіральнікаў гістарычных крыніц (назва ўтворана па аналогіі з «чорнымі» археолагамі. – *К. С.*). Адзначаюцца таксама і масавыя страты гістарычных крыніц у часы Другой сусветнай вайны [2].

На погляд аўтара, прысутнічае неабходнасць удзяляць менш увагі кантэкстам, якія абумовілі страту гістарычных крыніц, і засяродзіцца на пытаннях пошуку як мага большай колькасці дакументаў і матэрыялаў, якія захаваліся на сённяшні дзень.

**Асноўная частка.** Адным са шляхоў вырашэння праблемы недастатковасці крыніцазнаўчай базы ў дадзеным выпадку з'яўляецца развіццё археаграфічнай экспедыцыйнай дзейнасці і правядзенне даследаванняў у галіне практычнага крыніцазнаўства, якое, акрамя пытанняў аналізу і крытыкі гістарычных крыніц, накіравана таксама на пытанні, звязаныя з эўрыстыкай дакументаў і матэрыялаў [3, с. 200–201], што шчыльна збліжае дадзеную дысцыпліну з палявой археаграфіяй.

Актуальнасць палявых археаграфічных даследаванняў абумоўлена тым, што ў крыніцазнаўстве называецца феноменам «дакументальнага калапсу» – моцнай сувяззю дакумента з месцам яго стварэння (калі гістарычная крыніца, якая пакінула месца свайго стварэння, абавязкова вяртаецца ў яго, можа быць знішчана ў ім і г. д.) [4, с. 66]. Пад гэтым феноменам можна разумець акт арганічнай уключанасці любой гістарычнай крыніцы ў працэсы дзейнасці ўстановы, якая яе стварыла і, як вынік – існаванне сістэмы, па-за якой дакументны матэрыял губляе сэнс свайго быцця. Любы гістарычны дакумент праходзіць некалькі фаз, сярод якіх абавязковымі з'яўляюцца фаза задумы дакумента з мэтай рэгулявання пэўных аперацый унутры арганізацыі; фаза стварэння тэксту, на якой з'яўляюцца пэўныя тэксталагічныя асаблівасці, якія робяць кожную гістарычную крыніцу ўнікальнай; фаза ўкаранення дакумента ў арганізацыі, а таксама фаза яго функцыянавання, якая заключаецца ў наяўнасці ў гістарычнай крыніцы пэўнага функцыянала [4, с. 31–33]. Пазней, са згубленнем функцыянала, гістарычная крыніца становіцца рэччу, абстрагаванай ад функцыі, сведчаннем аб сімулякратыўнай гістарычнай рэальнасці [6, с. 38–39]. Страта дакументам практычнага сэнсу прыводзіць да ўключанасці яго ў наступныя фазы існавання – знішчэнне (змена фізічнага стану) або змяшчэнне ў архіў (змена прававога стану). Пры гэтым варта заўважыць, што ў выніку пэўных фактараў, сярод якіх можна назваць архіўны этатызм, чалавечы фактар і інш., не ўсе дакументы трапляюць у дзяржаўныя архіўныя ўстановы. Як вынік, шэраг з іх застаецца на руках у прыватных асоб або ва ўстанове-ствавральніку.

Напрыканцы XIX ст. М. П. Строеў, адзін з пачынальнікаў комплексных палявых прац па зборы пісьмовай спадчыны, сведчыў аб тым, што ў манастырскіх дрэўлесховішчах праваслаўнай царквы, а таксама на руках у старавераў Расійскай імперыі засталіся каштоўныя гістарычныя крыніцы. Дзейнасць М. П. Строева па зборы і камеральным апісанні дакументых матэрыялаў атрымала свой працяг у стварэнні шматлікіх археаграфічных камісій. Так, у 1864 г. была створана Віленская археаграфічная камісія, мэтай якой з'яўляліся актыўны збор і публікацыя дакументаў па гісторыі тагачасных беларуска-літоўскіх губерняў [6, с. 27].

Актыўныя даследаванні, прысвечаныя ўсім хрысціянскім канфесіям, праводзіліся таксама ў савецкі перыяд на саюзным узроўні і былі звязаны з часопісам «Археаграфічны штогоднік» і такімі імёнамі, як С. Н. Валк, С. О. Шмідт, М. М. Ціхамінаў і інш. [7, с. 85]. Палявая археаграфічная традыцыя, адметнай асаблівасцю якой было функцыянаванне пры інстытутах Акадэміі навук СССР археаграфічных лабараторый, атрымала свой працяг у Расійскай Федэрацыі. Сярод вядучых спецыялістаў можна назваць І. В. Пазднееву, І. В. Пачынскую, С. А. Белабародава і шмат іншых.

Варта адзначыць, што для сучаснай расійскай гуманітарнай навукі выключная важнасць археаграфічнай дзейнасці з'яўляецца бясспрэчнай. Так, С. М. Каштанаў, адзін з найбольш уплывовых савецкіх і расійскіх крыніцазнаўцаў, падкрэслівае значнасць палявой эўрыстыкі ў працэсах увядзення ў навуковае поле даследчыка крыніц, доступ да якіх абмежаваны па шэрагу прычын [8, с. 13–14].

У савецкай Беларусі археаграфічныя вышуканні з'яўляліся спарадычнай з'явай і адзінкавыя экспедыцыі адбываліся толькі ў 1920-я гг., пазней палявая дзейнасць была прыпынена з-за недахопу сродкаў. Сярод тых, хто займаўся арганізацыяй дадзенага віду прац, – К. Ю. Шкільтэр [9, с. 5–6],

М. В. Мялешка [10, с. 15] і інш. На жаль, дадзеныя навукоўцы не пакінулі пасля сябе грунтоўных прац, якія раскрылі б асноўныя метады іх даследаванняў. Вынікам дзейнасці названых вышэй асоб стала паступленне ў Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі шэрага спраў сярэдзіны XVIII – канца XIX ст. Так, на сённяшні дзень на захаванні знаходзяцца дакументы Выдрэйскай Латкалоніі за 1883–1893 гг. [11], арыгінал інвентару маёнтка Скрыгалаў у Мазырскім павеце за 1740 г. [12] і шмат інш.

У сучасны перыяд працы падобнага характару наогул не праводзіліся і прыток «новых» гістарычных крыніц адбываўся, як правіла, або з дапамогай працы ў замежных архівах, або з дапамогай спарадычных знаходак у кляштарах і касцёлах. Так, Дз. В. Лісейчыкаў апісваў выпадковыя знаходкі дакументальных помнікаў у в. Вішнёва [13] і шэрага населеных пунктаў на Палессі [14]. Варта адзначыць, што ўказаны вышэй аўтар падкрэсліваў, што ў прыватных асоб, а таксама ў шэрагу цэркваў і касцёлаў могуць знаходзіцца каштоўныя гістарычныя крыніцы [15, с. 97].

З мэтай выяўлення дадзеных крыніц, а таксама ўвядзення іх у навуковы ўжытак з 2015 г. у Цэнтральным навуковым архіве Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, які з'яўляецца структурнай адзінкай Інстытута гісторыі НАН Беларусі, пачалі ладзіцца комплексныя археаграфічныя экспедыцыі. Варта адзначыць, што фактычная адсутнасць палявых прац прывяла да таго, што да гэтага часу не выпрацавана айчынная методыка збору гістарычных матэрыялаў. У дадзеным артыкуле аўтар прапануе ўласныя метады выяўлення і збору дакументаў, выкарыстаныя ім падчас экспедыцый па Гродзенскім і Віцебскім Дыяцэзах, а таксама па Мінска-Магілёўскім архідыяцэзу ў 2015–2017 гг.

Даследуючы гісторыю Рымска-каталіцкага касцёла ў Беларусі, варта памятаць аб тым, што аб'ект даследавання з'яўляецца традыцыяналісцкай структурай з трывалымі выпрацаванымі нормамі і правіламі. Адзначаныя вышэй нормы і правілы, якія рэгламентуюць арганізацыю душпастырскай, гаспадарчай і іншай дзейнасці, знайшлі сваё адлюстраванне і ў адносінах касцёла да ўласных архіваў. Так, у параграфе 3 Канона 491 Кодэкса кананічнага права ў рэдакцыі 1983 г. [16, с. 219] адзначаецца, што жадаючыя працаваць з дакументамі парафіяльных архіваў абавязаны карыстацца нормамі, устаноўленымі мясцовым біскупам, а параграф 5 Канона 535 указвае на вяршэнства партыкулярнага права ва ўсіх пытаннях, якія датычаць гістарычных крыніц мясцовага касцёла [16, с. 240]. Такім чынам, адзіным магчымым шляхам працы з названымі вышэй матэрыяламі з'яўляецца атрыманне персанальных дазволаў у дыяцэзіяльнага біскупа. Пры гэтым нельга не адзначыць той факт, што выяўленне і каталагізацыя дакументаў у парафіях не рабіліся, таму дакладнага спісу дакументных помнікаў не існуе. Фактычна гэта абазначае, што выяўленне крыніц праводзіцца «ў сляпую».

Для аналізу заканамернасцей у працэсах захаванасці гістарычных крыніц, а таксама з мэтай устанаўлення ўзроўню рэпрэзентатыўнасці палявых даследаванняў усе парафіі Рымска-каталіцкага касцёла ў Беларусі былі падзелены на тры вялікія ўзаемавыключальныя кластары: парафіі, якія функцыянавалі ў савецкі перыяд; парафіі, якія закрываліся ў савецкі перыяд; парафіі, створаныя ў постсавецкі перыяд. У ходзе даследавання з дапамогай метаду кластарнай выбаркі ўстаноўлена, што з вялікай доляй верагоднасці (да 90 %) парафіі, касцёльныя будынкі якіх не былі канфіскаваныя ці знішчаныя ў савецкі перыяд, захавалі гістарычныя дакументы за XVI–XX стст. Таксама адзначаецца спарадычная захаванасць крыніц у парафіях, будынкі якіх канфіскоўваліся [17, с. 215–219].

У выніку правядзення выязных прац устаноўлена, што самымі буйнымі з'яўляюцца дакументныя зборы ў парафіях Поразава, Ішчална, Белагруда, Жырмуны, Гродна (Маці Божай Анёльскай, пафранцысканская), Канвелішкі, Ліда (Уздвіжання Святога Крыжа), Нача, Рось, Селіванаўцы, Ваўкалата, Вішнёва, Нясвіж, Паланэчка, Ішкалдзь, Шарашова, Бяроза і інш. Кожны з касцёлаў назапасіў падобныя віды гістарычных крыніц, якія раўнамерна ахопліваюць перыяд канца XVI – канца XX ст. Колькасць спраў – ад 30 да 250 адзінак у кожным.

Шэраг парафій з гэтай групы ў сваю чаргу мае фрагментарна захаваныя архівы. Так, у парафіі Воўпа маюцца рэгістры братоў і сёстраў брацтва Ружанца за 1789 г., шэраг візітаў парафіі біскупам Р. Ялбжыкоўскім за 1930–1939 гг., інвентары за 1884, 1887, 1934 гг., кнігі Веліканочных споведзяў за 1843 г., кнігі хрышчэнняў за 1801–1827 гг., алфавітны рэестр асоб, ахрышчаных

у перыяд 1764–1849 гг. У парафіі Струбніца захаваліся фрагменты візітаў за 1820–1880 гг., кнігі перадшлюбных экзаменаў за 1893–1919 гг. У Ляцкай парафіі – інвентар за 1936 г., спіс парафіян за 1909 г.; у Зяневічах – парафіяльныя спісы за 1925 г., у Лабно – капулятыўныя метрычныя кнігі за 1943–1949 гг., у Гарадзеі – справа аб пабудове касцёла за 1934–1939 гг. з унікальнымі акварэльнымі выявамі касцёла, зробленымі вядомым віленскім архітэктарам Янам Бароўскім; у Навагрудскай Фары – мноства матэрыялаў, датычных шлюбаў за 1931–1939 гг., у Камаях – мноства ўваходных папер за 1921–1939 гг., а таксама 5 тамоў касцёльнай хронікі і ўспамінаў мясцовых жыхароў і г. д. Падобная сітуацыя склалася таксама ў парафіях Правыя Масты, Адамавічы, Мікелеўшчына, Ваўкавыску (Св. Станіслава Косткі), Навагрудку (Св. Міхала Арханёла), Жалудку, Бярозаўцы, Шчучыне, Крупе, Мінойтах, Мсцібаве, Варанянах, Германішках, Ваверцы, Шылавічах, Ліпнішках, Гожы, Эйсымантах, Слоніме, Раготне, Глыбокім, Канстанцінаве, Удзеле і шмат інш. Агульная колькасць крыніц у кожнай асобна ўзятай парафіі ў дадзеным выпадку складае ад 1 да 10 адзінак.

Шэраг матэрыялаў быў выяўлены на руках у мясцовых жыхароў. Так, адметным з’яўляецца асобнік Святога Пісання 1888 г. выдання, знойдзены падчас інтэрв’юіравання парафіян касцёла Уздвіжання Святога Крыжа на гарышчы аднапавярховага жылога будынка ў г. Ліда. Шэраг аркушаў з гэтай кнігі выкарыстоўваўся як прыватны дзённік, што робіць яе яшчэ больш каштоўнай крыніцай. Так, знойдзены запісы неўстаноўленай асобы, датаваныя 1951 г., аб арышце і асуджэнні на 25 гадоў высылкі бацькі дадзенага чалавека, які быў мясцовым кавалём [18, с. 160].

Такім чынам, першым этапам палявой археаграфічнай працы ў дачыненні да дакументаў Рымска-каталіцкага касцёла ў Беларусі з’яўляецца атрыманне дазволаў мясцовых біскупаў; выяўленне месцаў, у якіх патэнцыяльна могуць знаходзіцца гістарычныя крыніцы, і выязное абследаванне парафій для аналізу колькасных паказчыкаў і стану названых вышэй дакументаў.

Па выніках правядзення ўзгаданых вышэй прац можна казаць аб тым, што дастаткова значная частка крыніц па гісторыі Рымска-каталіцкага касцёла ў Беларусі захавалася ў парафіях, якія функцыянавалі ў савецкі перыяд. Спарадычна гістарычныя крыніцы захаваліся ў парафіях, якія закрываліся, а таксама ў мясцовых жыхароў.

Устаноўлена, што выяўленыя дакументакомплексы маюць неаднародныя якасна-колькасныя паказчыкі. Прааналізаваць прычыны такой неаднароднасці дапамагае даследаванне гісторыі парафій, якое з’яўляецца наступным этапам палявых археаграфічных прац. Даследаванне гісторыі парафій, акрамя аналізу тэкстаў інвентароў, візітаў і іншых гістарычных крыніц, патрабуе шырокага прымянення такога міждысцыплінарнага метаду, як інтэрв’юіраванне і вядзенне дзённікаў археаграфічнай палявой экспедыцыі. Інтэрв’ю ў сукупнасці з запісам візуальных аглядаў касцёльных і плябаніяльных будынкаў, ацэнкі стану захаванасці носьбітаў інфармацыі і г. д. дазваляюць канструіраваць лёс гістарычных дакументаў. Нельга не адзначыць, што шэраг выяўленых у Рымска-каталіцкіх парафіях крыніц з’яўляецца ўнікальным. Інтэрв’юіраванне дазваляе ўстанавіць умовы, у якіх і дзякуючы якім гэтыя дакументы былі створаны. Так, у парафіі Св. Яна Хрысціцеля ў аг. Валкалата быў знойдзены неатрыбутаваны дзённік з подпісам «Zapisy leczyć. Recepty». Старэйшыя з жывучых парафіян далі звесткі аб тым, што адзін з мясцовых пробашчаў, кс. Рамуальд Дроніч, у 1930-я гг. займаўся запісамі рэцэптаў і сам ствараў лекі на аснове траў. Аналіз почырку і параўнанне яго з почыркам шэрага атрыбутаваных крыніц указанага перыяду пацвердзілі тое, што дадзены дзённік належаў кс. Р. Дронічу [19].

Да ўнікальных крыніц можна аднесці таксама справы мясцовых камітэтаў па культавым будаўніцтве часоў ІІ Рэчы Паспалітай. Так, была выяўлена справа аб пабудове касцёла ў Гарадзеі ў канцы 1930-х гг. У тэчцы змяшчаецца некалькі невядомых акварэлей з выявамі неіснуючага на той момант будынка. Параўнанне аўтографа «J. B.» з аўтографамі мастакоў і архітэктараў указанага перыяду, а таксама параўнанне выявы з вядомымі выявамі касцёлаў дазволіла вызначыць, што дадзеныя малюнкі з’яўляюцца невядомымі раней творамі знакамітага польскага архітэктара Яна Бароўскага (1890–1951 гг.) [20].




Мал. 1. Невядомы раней акварэльны малюнак архітэктара Яна Бароўскага,
знойдзены падчас археаграфічных экспедыцый

Fig. 1. Unknown earlier watercolor drawning of architect Jan Borowski,
discovered during archeographic expedition

Інтэрв’юіраванне і апытанні дазваляюць устанавіць прычыны страты дакументных помнікаў. Так, сведчанні мясцовых жыхароў аб пажары ў плябаніі парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Струбніца ў 1990-я гг. у сукупнасці з візуальным аглядам нешматлікіх захаваных дакументаў парафіяльнага архіва, пашкоджаных агнём, указваюць на тое, што гістарычныя крыніцы на момант пажару знаходзіліся ў плябаніі і былі часткова знішчаны [21].

Яшчэ адным шляхам страты дакументнай спадчыны з’яўляецца такі чыннік, як раздача святарамі ў савецкі перыяд (з мэтай пазбегнуць канфіскацыі. – *К. С.*) гістарычных крыніц мясцовым жыхарам, у якіх яны гінулі праз неналежнае захаванне ці проста не былі вернутыя ў касцёл. Так, ксёндз парафіі Св. Яна Хрысціцеля ў в. Масты Правыя сведчыў аб тым, што напачатку 1990-х гг. мясцовыя жыхары вярталі ў касцёл парэшткі архіва. На сённяшні дзень у касцельным архіве з усяго магчымага комплексу дакументаў захаваліся толькі перадшлюбныя пратаколы за 1917–1921 гг. Аб падобным засведчыла ў інтэрв’ю жыхарка г. Шчучын Г. С. (імя і прозвішча не называюцца па просьбе інтэрв’юіраванай. – *К. С.*) у адносінах да парафіі Св. Тэрэзы Авільскай [22]. У 1988 г., калі касцёл быў аддадзены вернікам, дакументы і матэрыялы вярнуліся ў яго. Аб аналагічным выпадку ў парафіі Найсвяцейшага Сэрца Езуса ў в. Сейлавічы сведчыў краязнаўца С. С. Суднік [23].

Чыннікам страты дакументнай спадчыны, блізкім да папярэдняга, з'яўляецца таксама дзейнасць «чорных» археографаў. Так, у 1928 г. сябры Цэнтральнага бюро краязнаўства У. Мікіцкі, Р. Пяцэвіч, П. Ажэўскі, якія ладзілі этнаграфічную экспедыцыю па Случчыне, сведчылі аб тым, што, паводле слоў святара парафіі Князь-Ваверская, частка гістарычных дакументаў і старадрукаваных кніг, якія знаходзіліся ў касцёле, была вывезена ў невядомым кірунку старшынёй Дзякавіцкага валаснога выканаўчага камітэта Шапірам (ініцыялы не ўстаноўлены. – *К. С.*) [24, с. 31]. На сённяшні дзень лёс гэтых крыніц невядомы. Вядома таксама аб існаванні няпэўных археаграфічных экспедыцый, якія з'явіліся пасля аб'яднання Заходняй Беларусі з БССР у верасні 1939 г. і спрыялі адтоку гістарычных дакументаў за межы краіны [25, с. 120]. Дадзеныя гістарычныя крыніцы трапілі ў прыватныя калекцыі і на сённяшні момант вядуцца працы па іх рэстытуцыі. Так, у 2012 г. у Беларусь з прыватнай калекцыі была вернута адна з метрычных кніг парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Ішкалдзь [26].

Шэраг гістарычных крыніц з т. зв. ордэнскіх парафій (якімі апекаваліся ордэны і кангрэгацыі або святары якіх з'яўляліся братамі пэўных ордэнаў) быў вывезены на захаванне ў Літву і Польшчу ў правінцыяльныя архівы. У прыватнасці, францысканцы і дамініканцы масава эвакуіравалі свае дакументныя зборы ў Кракаў. Як вынік – вялікая колькасць крыніц па гісторыі ордэнаў і кангрэгацый у Беларусі на сённяшні дзень знаходзіцца ў правінцыяльных архівах [1, с. 127–128].

Яшчэ адным чыннікам страты дакументаў парафіяльных архіваў з'яўляецца канфіскацыя шэрага крыніц дзяржаўнымі архівамі і органамі ЗАГС у адпаведнасці з Цыркулярам НКУС ад 18 лістапада 1919 г. Савецкую ўладу, у прыватнасці, цікавілі метрычныя кнігі і дакументы, датычныя да іх, – перадшлюбныя экзамены, рэвізскія казкі, пасямейныя спісы і г. д. [27, с. 57]. У Заходняй Беларусі, якая ўваходзіла ў склад II Рэчы Паспалітай да верасня 1939 г., мерапрыемствы па канфіскацыі гістарычных крыніц праводзіліся толькі пасля далучэння гэтых тэрыторый да БССР у 1940–1960-я гг. Напрыклад, метрычныя кнігі парафіі Белагруда, у выніку канфіскацыі ў 1960-я гг., знаходзяцца на захаванні ў Дзяржаўным гістарычным архіве ў г. Гродне, аднак у самой парафіі захаваліся інвентары за 1710–1939 гг., візіты за аналагічны перыяд, кнігі карэспандэнцыі, бежмаванняў, ноты, кнігі перадшлюбных іспытаў, спісы парафіян і г. д. Аналагічны факт канфіскацыі метрычных кніг дакладна ўсталяваны ў Ваўкавыску ў 1940 г. [28, с. 190] і шмат дзе інш. Звартае на сябе ўвагу нешматлікасць гістарычных дакументаў у фондах парафіяльных касцёлаў. Так, з парафіі Вярэйкі ў НГАБ у Гродне трапіла 5 спраў [29], Свір – 3 справы [30], Косава – 15 спраў [31], Вялікую Бераставіцу – 2 справы [32] і шмат інш. Пры гэтым нельга не адзначыць, што парафіі, канфіскацыя дакументаў у якіх не праводзілася, захоўваюць дакументальныя масівы колькасцю 150–250 адзінак захавання. Гэта дазваляе казаць аб знішчэнні гістарычных крыніц у дзяржаўных архівах у савецкі час.

Галоўным фактарам страты дакументаў з'яўляецца іх неналежнае захаванне. Так, паводле інвентароў шматлікіх парафій можна ўстанавіць, што мясцовыя святары захоўвалі гістарычныя крыніцы, пачынаючы з канца XVI ст., двума шляхамі – у плябаніяльнай канцылярыі ў шафах, перашытыя і пранумараваныя паводле храналагічнага прынцыпу, як тое было, напрыклад, у Ішчалне, Ішкалдзі, Лядску [33, арк. 7] і шмат інш., або на касцёльным гарышчы, у адмысловых куфрах з перфарыраванымі сценкамі. У дадзеным выпадку дакументы перасыпаліся атрутнымі сродкамі з мэтай недапушчэння знішчэння паперы грызунамі. Падобным метадам захавання гістарычных дакументаў карысталіся ў Лідскім Фарным касцёле, Воўпе, Валкалаце [34, арк. 5] і шмат інш. Трэба адзначыць, што на дадзены момант у парафіях існуе сістэма захавання крыніц, падобная на тую, якая існавала ад канца XVI ст.

Шэраг матэрыялаў захоўваўся ў мяхах ці наогул у россыпу без прымянення сродкаў, якія прадухіляюць знішчэнне дакументаў ад вільгаці і сонечнага святла. Напрыклад, гістарычныя крыніцы касцёла Св. Міхала Арханёла ў Навагрудку на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў знаходзіліся на гарышчы культавага будынка, які залівала вадой, як вынік – пры абследаванні архіва прыйшлося канстатаваць поўную страту матэрыялу. Гістарычныя крыніцы Жырмунскага касцёла таксама знаходзіліся на гарышчы будынка і былі падтопленыя вадой, аднак іх удалося выратаваць і высушыць.



Мал. 2. Знаходка гістарычных крыніц на гарышчы ў парафіі Св. Яна Хрысціцеля ў аг. Валкалата
Fig. 2. Finding historical sources in the attic in the parich of St. John Baptist in the village Volkolata

Усе названыя вышэй фактары ўплыву на стан дакументных матэрыялаў ствараюць іх прадметны асяродак, аналіз якога дазваляе планаваць у доўгатэрміновай перспектыве тыя аперацыі і тэрміны іх прымянення, якія неабходна праводзіць у адносінах да дакументаў тых ці іншых парафіяльных архіваў.

Кажучы аб археаграфічнай працы, датычнай культавага дакумента, варта памятаць, што названыя вышэй гістарычныя крыніцы створаны ў працэсах дзейнасці ўстановы, якая на сённяшні момант функцыянуе, таму з'яўляюцца яе непасрэднай уласнасцю. Варта адзначыць, што пытанні ўласнасці ў адносінах да гістарычных дакументаў канфесійных устаноў у Рэспубліцы Беларусь не ўрэгуляваны належным чынам. У сваю чаргу многія даследчыкі лічаць, што ўсе такія гістарычныя крыніцы з'яўляюцца ўласнасцю хрысціянскай царквы [15, с. 98]. Падобныя пытанні неаднаразова ўзнімаліся і ў расійскім археаграфічным асяродку і да гэтага моманту застаюцца спрэчнымі [35, арк. 17–22].

Аптымальным у дадзеным выпадку рашэннем з'яўляецца перавод гістарычных крыніц у электронны фармат і іх капіраванне на прылады захавання інфармацыі, прычым арыгінал дакумента застаецца ў парафіі. Пры гэтым варта адзначыць, што капіраванне дакументаў можа суправаджацца пашкоджаннямі пераплёту, адставаннем вокладкі, выпадзеннем аркушаў, разрывам прашывачных нітак. Працэсы сканіравання і капіравання адмоўна ўплываюць на папяровы носьбіт інфармацыі і могуць пагоршыць яго фізічны стан. У той жа час аднаразовае сканіраванне з дапамогай планшэтных сканераў на стан тэксту (выцвітанне атраманту, ломкасць паперы і інш.) не ўплывае [36].

У сувязі з прыведзеным вышэй, гістарычныя крыніцы, сабраныя падчас археаграфічных экспедыцый, варта пераводзіць у электронны фармат двума магчымымі метадамі: там, дзе не існуе пагрозы механічнага пашкоджання, – з дапамогай кніжных і планшэтных сканераў; там, дзе маюцца пагрозы страты тэксту, разрыву аркушаў і інш., – з дапамогай прафесійных фотаапаратаў.

Наступным, не менш значным этапам археаграфічнага даследавання з'яўляецца камеральнае апісанне і ўпарадкаванне сабранага ў даследчыцкім полі матэрыялу (т. зв. RAW). Камеральны метад, маючы інтэрсуб'ектыўную прыроду, накіраваны перадусім на стварэнне з «сырога» матэрыялу пэўнай сістэмы, якая дае агульнае ўражанне аб прадмеце даследчыцкага інтарэсу. Акрамя апісання саміх гістарычных крыніц, якія знаходзяцца ў касцёлах, паўстае пытанне апісання неструктураванай кантэкстнай інфармацыі, прыкладам якой з'яўляюцца запісы інтэрв'ю і ўзгадак мясцовых жыхароў, гістарычных звестак аб парафіях, традыцыйнай кангрэгацыйнай прыналежнасці мясцовых святароў і г. д. [7, с. 87].

Вынікам падобнай археаграфічнай дзейнасці і правядзення ўсіх названых вышэй этапаў даследавання, аналізу і апісання гістарычных крыніц стала стварэнне ў Цэнтральным навуковым архіве Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі архіўнай калекцыі № 3С «Материалы полевых археографических экспедиций», у якой на сённяшні момант знаходзіцца каля 700 адзінак захавання ў электронным фармаце. Храналагічна дадзеныя дакументы ахопліваюць перыяд з канца XVI па сярэдзіну XX ст.

**Высновы.** Такім чынам, дастаткова буйны комплекс крыніц па гісторыі Рымска-каталіцкага касцёла ў Беларусі знаходзіцца на дадзены момант у парафіях, а таксама ў мясцовага насельніцтва. Вырашэннем пытанняў выяўлення і збору указаных дакументаў з'яўляюцца палявыя археаграфічныя працы. Дадзены від даследаванняў арганізуецца ў некалькі этапаў, сярод якіх – атрыманне дазволаў дыяцэзіяльнай адміністрацыі; выяўленне месцаў патэнцыяльнага знаходжання гістарычных крыніц; выезд у парафію для аналізу стану захаванасці і колькасных паказчыкаў выяўленых дакументаў; аналіз фактараў, якія ўплывалі на іх захаванасць; стварэнне электронных копій; апрацоўка і камеральнае апісанне знаходкі. Палявыя археаграфічныя экспедыцыі дазваляюць значна пашырыць крыніцазнаўчую базу па канфесійнай гісторыі, што дазваляе больш эфектыўна даследаваць канструкты, датычныя рэлігійных фактараў, якія паўплывалі на гістарычнае развіццё Беларусі.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Зянюк, Р. У. Каталіцкая адукацыя на беларуска-літоўскіх землях у канцы XVIII – пачатку XX (па матэрыялах архіваў манаскіх ордэнаў і кангрэгацый Польшчы) / Р. У. Зянюк // Архівы і Справаводства. – 2011. – № 2. – С. 127–135.

2. Щеглов, А. А. Обирать или просвещать? (материалы дискуссии на страницах журнала «Златоструй» в 1990–1992 гг.) / А. А. Щеглов // Библиотека Староверия [Электронный ресурс]. – 1990. – Режим доступа: http://samstar-biblio.ucoz.ru/publ/179–1–0–821. – Дата доступа: 01.10.2017.

3. Теория и методология исторической науки. Терминологический словарь; отв. ред. А. О. Чубарьян. – М.: Аквилон, 2014. – 576 с.

4. Козлов, В. П. Основы теоретической и прикладной археографии / В. П. Козлов. – М.: РОССПЭН, 2008. – 224 с.

5. Сыцько, К. В. Канфесійныя архівы ў «пострэлігійную» эпоху / К. В. Сыцько // Архіварыус. – 2016. – Вып. 14. – С. 34–43.

6. Батракова, М. П. Віленская археаграфічная камісія / М. П. Батракова // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1978. – № 1. – С. 27–29.

7. Дутчак, Е. Е. Полевая археография вчера, сегодня и завтра: размышления о новых публикациях Московского университета / Е. Е. Дутчак // Вестн. Томск. гос. ун-та. – 2015. – № 396. – С. 85–90.

8. Каштанов, С. М. Об археографической комиссии / С. М. Каштанов // Археографический ежегодник. – 2006. – б/н. – С. 13–16.

9. Шкільтэр, К. Ю. Латыскія колёніі на Беларусі: гістарычнае развіццё латыскіх сялянскіх гаспадарак / К. Ю. Шкільтэр. – Мінск: Латыскі сектар Беларускай Акадэміі навук, 1931. – 274 с.

10. Мялешка, М. В. Краязнаўства і архівы Беларусі / М. В. Мялешка // Наш Край. – 1927. – № 11. – С. 14–17.

11. Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦНА НАН Беларусі). – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 6.

12. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 17.

13. Лісейчыкаў, Д. В. Сенсацыйная знаходка ў мурах Вішнеўскага касцёла / Д. В. Лісейчыкаў // Архивы и делопроизводство. – 2015. – № 5. – С. 67–71.

14. Лісейчыкаў, Д. В. Архіўныя багацці скірмунтаўскага Парэчча / Д. Лісейчыкаў // Архивы и делопроизводство. – 2014. – № 3. – С. 59–62.

15. Лісейчыкаў, Д. В. Архівісты ўпершыню вызначылі сапраўднасць і апісалі дакументы архіва праваслаўнага храма / Д. В. Лісейчыкаў // Архивы и делопроизводство. – 2014. – № 1. – С. 97–104.

16. Кодекс канонического права: утв. в апостольской конституции Папы Римского Иоана Павла II «Sacrae disciplinae leges» в 1983 г. – М.: Ин-т философии, теологии и истории св. Фомы, 2007. – 624 с.

17. Сыцько, К. В. Асаблівасці палявой эўрыстыкі дакументальных помнікаў па гісторыі Рымска-каталіцкіх парафій у Беларусі / К. В. Сыцько // 500 гадоў беларускага кнігадрукавання. Ч. 1.: матэрыялы Міжнар. кангр., Мінск, 14–15 верасня 2017 г. / Нац. б-ка Беларусі; склад.: А. А. Суша. – Мінск, 2017. – С. 215–219.
18. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 4. Спр. 11.
19. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 12. Спр. 1.
20. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 13. Спр. 1.
21. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 14. Спр. 9.
22. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 3. Спр. 4.
23. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 4. Спр. 12.
24. Мікіцкі, У. Падарожжы па Случчыне / П. Ажэўскі, Р. Пяцэвіч, У. Мікіцкі // Наш край. – 1928. – № 2 (29). – С. 24–44.
25. Шумейко, М. Ф. Сентябрь 1939 г. в судьбе белорусских архивов / М. Ф. Шумейко // Архивы и делопроизводство. – 2009. – № 5. – С. 113–121.
26. Інфармацыя аб перадачы на захаванне ў НГА Беларусі метрычнай кнігі // Афіцыйны сайт дзяржаўнай установы «Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://niab.by/news/2012/. – Дата доступу: 23.10.2017.
27. Елпатьевский, А. В. К истории документирования актов гражданского состояния в России и СССР / А. В. Елпатьевский // Актовое источниковедение: Сб. ст. / Ин-т истории СССР; редкол.: С. М. Каштанов (отв. ред.) [и др.]. – М., 1979. – С. 55–59.
28. Быховцев, Н. И. Первые Советы. – Рига: Ин-т белорусской истории и культуры, 2012. – 368 с.
29. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродне (НГАБГр.). – Ф. 297. Воп. 1. Спр. 1–5.
30. НГАБГр. – Ф. 438. Воп. 1. Спр. 1–3.
31. НГАБГр. – Ф. 486. Воп. 1. Спр. 1–16.
32. НГАБГр. – Ф. 717. Воп. 1. Спр. 1–2.
33. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 15. Спр. 1.
34. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 12. Спр. 14.
35. Козлов, В. П. Современные реалии археографической деятельности в России / В. П. Козлов // Археографический ежегодник. – 2006. – б/н. – С. 17–22.
36. Михеенок, Т. С. Влияние копировально-множительной техники на сохранность архивных документов / Т. С. Михеенок // Афіцыйны сайт дзяржаўнай установы «Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://niab.by/stat/cop_doc/. – Дата доступу: 29.10.2017.

## References

1. Zyanyuk R. U. Catholic education at the Belarusian-Lithuanian lands in the late XVIII– early XX (based on the archives of religious orders and congregations in Poland). *Arkhivy i Spravavodstva* [Archives and Records Management], 2011, no 2, pp. 127–135 (in Belarusian).
2. Scheglov A. A. To take away or enlighten? (Materials of the discussion on the pages of the magazine «Zlatostruy» in 1990–1992). *Old Believer Library*. Available at: http://samstar-biblio.ucoz.ru/publ/179–1-0–821 (accessed 01 october 2017) (in Russian).
3. Chubaryan A. O. (ed.) *Theory and methodology of historical science. Terminological dictionary*. Moscow, Akvilon Publ., 2014. 576 p. (in Russian).
4. Kozlov V. P. *Fundamentals of theoretical and applied archeography*. Moscow, Russian Political Encyclopedia Publ., 2008. 224 p. (in Russian).
5. Syitsko K. V. Confessional archives in the «post-religious» era. *Arkhivaryus* [Archivist], 2016, vol. 14, pp. 34–43 (in Belarusian).
6. Batrakova M. P. The Vilna Archeographic Commission. *Pomniki gistoryi i kul'tury Belarusi* [Monuments of History and Culture], 1978, no 1, pp. 27–29 (in Belarusian).
7. Dutchak E. E. Field archaeography yesterday, today and tomorrow: reflections on new publications of the Moscow University. *Vestnik Tomskogo gosudarstvennogo universiteta = Tomsk State University Journal,* 2015, no 396, pp. 85–90 (in Russian). DOI: 10.17223/15617793/396/15
8. Kashtanov S. M. About the archaeographic commission. *Archaeographic Yearbook 2006*. Moscow, Nauka Publ., 2011, pp. 13–16. (in Russian).
9. Shkilter K. Yu. *Latvian settlements in Belarus: the historical development of Latvian rural economies*. Minsk, Latvian sector of the Belarusian Academy of Sciences, 1931. 274 p. (in Belarusian).
10. Myaleshka M. V. Regional studies and archives of Belarus. *Nash Kray* [Our Land], 1927, no 11, pp. 14–17 (in Belarusian).
11. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus*. F. 3. L. 1. C. 6 (in Russian).
12. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus*. F. 3. L. 1. C. 17 (in Russian).
13. Liseychyikau D. V. Sensational discovery in the walls of the Vishnevsky church. *Arhivyi i deloproizvodstvo* [Archives and records management], 2015, no 5, pp. 67–71 (in Belarusian).
14. Liseychyikau D. V. Archival riches of Skirmunt Porechie. *Arhivyi i deloproizvodstvo* [Archives and records management], 2014, no 3, pp. 59–62 (in Belarusian).
15. Liseychyikau D. V. Archivists first identified the authenticity and described the documents of the Orthodox church. *Arhivy i deloproizvodstvo* [Archives and records management], 2014, no 1, pp. 97–104 (in Belarusian).

16. *Kodeks kanonicheskogo prava.* Moscow, Institute of Philosophy, Theology and History of St. Thomas, 2007. 624 p. (in Russian).

17. Syitsko K. V. Features Field heuristics documentary monuments of the history of Roman Catholic parishes in Belarus. *Materyiyalyi mizhnar. kangr. 500 gadoў belaruskaga knigadrukavannja. Minsk, 14–15 verasnja 2017 g. Ch. 1.* [500 years of Belarusian book printing: Proceedings of the International Congress. Minsk, 14–15 September 2017. Part 1]. Minsk, 2017, pp. 21–219 (in Belarusian).

18. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus*. F. 3S. L. 4. C. 11 (in Belarusian).

19. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus*. F. 3S. L. 12. C. 1 (in Belarusian).

20. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus*. F. 3S. L. 13. C. 1 (in Belarusian).

21. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus*. F. 3S. L. 14. C. 9 (in Belarusian).

22. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus*. F. 3S. L. 3. C. 4 (in Belarusian).

23. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus*. F. 3S. L.4. C. 12 (in Belarusian).

24. Mikitski U., Pyatsevich R., Azheuski, P. Traveling on Slutsk region. *Nash kray*[Our Land], 1928, no 2 (29), pp. 24–44 (in Belarusian).

25. Shumeyko M. F. September in the fate of the Belarusian archives. *Arhivy i deloproizvodstvo* [Archives and records management], 2009, no 5, pp. 113–121 (in Russian).

26. Information on the deposit in the NHA of Belarus the Parish Register. *National Historical Archives of Belarus*. Available at: http://niab.by/news/2012/ (accessed 23 october 2017).

27. Elpatevskiy A. V. To the history of documenting acts of civil status in Russia and the USSR. *Aktovoe istochnikovedenie: Sbornik statey* [Assembly source study: Collection of articles], 1979, pp. 55–59 (in Russian).

28. Byihovtsev N. I. *First Soviet*. Riga, Institute of Belarusian History and Culture, 2012. 368 p. (in Russian).

29. *National Historical Archive of Belarus in Grodno*. F. 297. L. 1. C. 1–5 (in Belarusian).

30. *National Historical Archive of Belarus in Grodno* F. 438. L. 1. C. 1–3 (in Belarusian).

31. *National Historical Archive of Belarus in Grodno* F. 486. L. 1. C. 1–16 (in Belarusian).

32. *National Historical Archive of Belarus in Grodno* F. 717. L. 1. C. 1–2 (in Belarusian).

33. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus*. F. 3S. L. 15. C. 1 (in Belarusian).

34. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus*. F. 3S. L. 12. C. 14 (in Belarusian).

35. Kozlov V. P. Modern realities of archeographic activity in Russia. *Archaeographic Yearbook 2006. Moscow, Nauka Publ., 2011,* pp. 17–22 (in Russian).

36. Miheenok T. S. Influence of copying and duplicating equipment on the preservation of archival documents. *National Historical Archives of Belarus*. Available at: http://niab.by/stat/cop_doc/ (Accessed 29 october 2017).

## Информация об авторе

**Сытько Кирилл Валерьевич** – магистр управления, младший научный сотрудник Центрального научного архива. Институт истории, Национальная академия наук Беларуси (ул. Академическая, 1, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: kirylawolny@gmail.com

## Information about the author

**Kiryl W. Sytsko** – MM, Junior Researcher of the Central Scientific Archive. Institute of History, National Academy of Sciences of Belarus (1 Akademichaskaya Str., Minsk 220072, Belarus). E-mail: kirylawolny@gmail.com